№ 34 (1847)
Серада, 25 лютага 2004 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец: УП «Народная воля».
Кошт свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Народная Воля

E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — -3...-1, без ападкаў, уначы — -4...-2, снег; у Брэсце ўдзень — -1...+1, без ападкаў, уначы — -2...0, снег; у Гродне ўдзень — -2...0, без ападкаў, уначы — -2...0, снег; у Віцебску ўдзень — -5...-3, уначы — -5...-3, на працягу сутак — без ападкаў; у Гомелі ўдзень — -1...+1, уначы — -7...-5, на працягу сутак — без ападкаў; у Магілёве ўдзень — -4...-2, сонечна, уначы — -6...-4, без ападкаў.

www.meteo.by

Ягору Рыбакову свеціць ад 7 да 15 гадоў турмы



Былому старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі (НДТРК) Ягору Рыбакову прад'яўлена афіцыйнае абвінавачанне.

Як паведаміў БелаПАН начальнік прэс-цэнтра Пракуратуры Рэспублікі Беларусь Юрый Азаронак, былы кіраўнік НДТРК **абвінавачваецца ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага ч. 3 арт. 430 Крымінальнага кодэкса (атрыманне хабару).** У адпаведнасці з кодэксам, гэтыя дзеянні "караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад 7 да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення".

Я.Рыбакоў быў вызвалены ад пасады старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі 13 лютага пасля сустрэчы прэзідэнта з Генеральным пракурорам Беларусі Віктарам Шэйманам, які далажыў пра выяўленыя факты супрацьпраўных дзеянняў з боку кіраўніка НДТРК. У гэты ж дзень Ягор Рыбакоў быў затрыманы. 16 лютага намеснік Генеральнага пракурора Віктар Прус санкцыянаваў прымяненне да Я.Рыбакова меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.
Калаж Алеся СІЛІЧА.

«Зубр» не адступае...

Тры затрыманыя міліцыяй у цэнтры Мінска актывісты маладзёжнага незарэгістраванага руху "Зубр" былі вызвалены міліцыяй праз некалькі гадзін пасля таго, як далі тлумачэнні. Афіцыйнай прычынай іх затрымання называлася высвятленне асобы.

Нагадаем, што 22 лютага больш чым 50 актывістаў "Зубра" пашыхтаваліся ў жывы ланцуг на праспекце Ф.Скарыны — ад Галоўнага паштамта да Кастрычніцкай плошчы. Яны трымалі партрэты зніклых у Беларусі вядомых людзей — Дзмітрыя Завадскага, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Юрыя Захаранкі, а таксама памерлага ў 1999 годзе апазіцыйнага палітыка Генадзя Карпенкі. Праз паўгадзіны пасля пачатку акцыі міліцыя пачала затрымліваць яе ўдзельнікаў. Усяго былі затрыманы 7 чалавек, аднак пасля прад'яўлення пашпартоў чатырох адразу ж адпусцілі.

Як паведамілі ў прэс-службе "Зубра", актывісты маюць намер працягваць акцыі, прысвечаныя зніклым палітыкам, пакуль не будзе праведзена сумленнае расследаванне прычын іх знікнення.

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ.

МТС не спіць у шапку...

Кампанія "Мабільныя ТэлеСістэмы" працягвае пашырэнне радыёпакрыцця ў гарадах, дзе ўжо ёсць сувязь МТС. Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе МТС, з 21 лютага запрацавала базавая станцыя ў сталічным мікраараёне Уручча, забяспечыўшы сувяззю раён будаўнічага рынку. З 20 лютага запушчана ў эксплуатацыю яшчэ адна базавая станцыя ў Наваполацку (Віцебская вобласць).

Адначасова працягваецца будаўніцтва сеткі на трасах і пагранічных пераходах у Гродзенскай вобласці. З 20 лютага сувязь МТС з'явілася на пераходзе Каменны Лог, а таксама ў пасёлках Целяжышкі, Навасёлкі (усе тры — Ашмянскі раён) і Крэва (Смаргонскі раён), якія знаходзяцца ўздоўж аўтамагістралі М7 Вільнюс—Мінск—Гомель—Кіеў. Зараз сувяззю МТС пакрыта больш як 70 працэнтаў беларускага ўчастка гэтай трасы.

Ірына САЗАНОВІЧ.

ТЕМА ДНЯ

Шаг назад?

Во вчерашнем номере нашей газеты опубликованы высказывания известных российских экспертов по газовой проблеме. Суть их в том, что Александр Лукашенко вынужден будет пойти навстречу Москве и принять ее условия, ибо у него нет иного пути. Если он "не договорится с Россией, ему придется уйти в отставку".

Еще, как говорится, не высохли чернила на этой публикации, как из уст Александра Григорьевича послышались примирительные нотки, изменился тон высказываний. Его пресс-служба сообщает, что на рабочем совещании по текущим экономическим вопросам глава государства подчеркнул, что переговоры с российской стороной не следует ни в коем случае политизировать, что этот вопрос сегодня стоит на уровне субъектов хозяйствования.

Это сегодня, а что было вчера? И кто политизировал? Разве не сам Александр Григорьевич?

В сообщении пресс-службы Лукашенко читаем про очередные реверансы в адрес России и упреки оппозиции. *"Недопустимыми считает глава государства попытки оппозиции раздуть в СМИ проблему отношений русских и белорусов"*, — говорится в сообщении пресс-службы. *"Русский народ и русские люди, которые живут у нас в Беларуси, — наши люди, я уже сколько раз говорил об этом, они не имеют никакого отношения к этой проблеме, как и все россияне, за исключением отдельных политиков, которые принимали решение по блокированию Беларуси"*, — отметил глава государства. По его словам, русский человек всегда готов последнюю рубашку снять и отдать белорусу, так же, как и мы.

Но ведь же руководитель "Газпрома" Миллер, говоря выше приведенным слогом, *"не хочет снимать свою рубашку"*, а требует высокой оплаты за газ. Или он не русский человек?

Далее в сообщении пресс-службы говорится: *"Президент заявил, что "раздувать национальную рознь в нашей тихой спокойной Беларуси мы никому позволить не должны". В этой связи он призвал решать экономические вопросы переговорным путем, как бы это сложно ни было"*.

Но кто раздувает национальную рознь? К кому относится резкое заявление российского МИДа, в котором, в частности, говорится о курсе, взятом на обострение отношений с Россией и о том, кто сделал вызывающее заявление, кто пытается переложить свои ошибки на Россию? О ком так говорил российский МИД?

Из этого вытекает, что Александр Лукашенко идет ленинским курсом — шаг вперед, два назад. Сейчас, очевидно, он отступает назад. Неужели сбудутся предсказания некоторых российских экспертов и он вынужден будет сдать свои позиции, и наши предприятия начнут переходить в руки российских олигархов?

Когда писались эти строки, в Москве шли переговоры по газовой проблеме. Об их итогах сообщим в следующем номере.

Евгений ТАВГЕНЬ.

ЛИЧНОЕ МНЕНИЕ

Владимир ГЛОД

Минск стал Москве неинтересен

Похоже, что все белорусские аналитики (автор и себя причисляет к их числу), просчитались, когда утверждали: до официального избрания Владимира Путина президентом Российской Федерации на второй срок Москва не будет применять никаких серьезных действий по отношению к Александру Лукашенко. И хотя сам Путин в ответ на резкие высказывания своего белорусского коллеги отмалчивается, все понимают — без его санкции "Газпром" не пошел бы на такие беспрецедентные меры. Тем более, что в российских СМИ промелькнула информация о том, что накануне прекращения транзита через белорусскую территорию российского газа руководитель "Газпрома" Алексей Миллер встречался с главой российского государства. И, похоже, петербургские "немцы" не обошли своим вниманием белорусскую ситуацию. Позже российский премьер Михаил Касьянов публично объяснил свое получасовое опоздание на заседание правительства беседой с Владимиром Путиным. Почему-то многие посчитали, что первые лица российской политики обсуждали ситуацию в Беларуси.

Суть конфликта всем хорошо известна. Россия вынуждена была закрыть задвижку, после того как белорусская сторона вычерпала свою февральскую квоту. После этого, по версии российской стороны, белорусы начали несанкционированный отбор или, говоря более понятным языком, воровство чужого газа. Специалисты говорят, что таким путем Беларусь ежедневно "прихватывает" солидные денежки. Московские аналитики утверждают: тем самым **"Газпром" показал — он готов нести колоссальные убытки. Ведь день газового простоя обходится в 5 млн. долларов за недопоставленный газ. А вместе с неустойками, которые придется выплачивать Польше, Германии, Литве и Латвии за то, что они остались без нашего газа, цифра может достигнуть 8—10 млн. долларов в сутки. Слишком дорого нам обходится дружба с Лукашенко".**

Если Россия внешне рассматривает проблему в ставшем уже для нее традиционном ключе многих конфликтных ситуаций (от Гусинского до Ходорковского) — якобы всего лишь в споре двух хозяйствующих субъектов, то Беларусь сразу же подняла ее до уровня политического. На известие об отключении Александр Лукашенко среагировал так: **"Хочет Путин, чтобы мы платили эти деньги, то давайте соберем их от лекарств чернобыльцев, от тех, кто гнил в окопах. Неужели мы не соберем эти 200 миллионов долларов? Соберем и снимем эту проблему, и нами перестанут манипулировать и шантажировать".**

Высказывание красноречивое, которое цитируют многие масс-медиа. Однако вне поля зрения большинства СМИ почему-то остался один, на мой взгляд, самый важный намек — Лукашенко дал понять, что приказ усилить давление на "маленькую, но гордую страну" поступил не по воле Кремля. Мол, высшему российскому руководству было дано соответствующее указание. Откуда? Догадаться весьма несложно — из Вашингтона.

Наверное, этот намек дал почву некоторым белорусским политикам вновь вернуться к версии, которая пошла гулять после недавней известной встречи в Риге. Тогда появилась информация о том, что Москва и Вашингтон якобы договорились о совместных действиях против Александра Лукашенко. По этому сценарию Кремль должен будет способствовать отстранению белорусского президента от активной политической деятельности. Взамен США соглашаются на инкорпорацию Беларуси Россией. В итоге в 2008 году Владимир Путин получит право баллотироваться в президенты некоего союзного образования, не нарушая при этом Конституцию Российской Федерации. И хотя представитель США в Риге сказал, что его страна не поддерживает такой вариант, тема для разговоров появилась. По меньшей мере один из лидеров коалиции "Европейский выбор" Николай Статкевич на пресс-конференции 20 февраля (она, правда, была посвящена другой теме) упомянул о такой возможности...

Мне кажется, что те аналитики, которые видят в газовом конфликте исключительно экономическую или, наоборот, только политическую подоплеку, не правы.



Здесь отчетливо пересекаются и одни, и другие интересы. Очевидно, что России надоело быть, по выражению ее лидера, дойной коровой для стран СНГ. После безмерной ельцинской щедрости Россия начала считать деньги. И теперь обеспечивать кого-то чем-то (в нашем случае — энергоносителями) в обмен на братские поцелуи она больше не желает. Решение понятное, прагматичное. Ведь еще прошлой осенью Владимир Путин на встрече с Александром Лукашенко в рамках заседания Высшего государственного совета Союзного государства говорил: если мы запутались и не знаем, кто кому сколько должен, мы должны перейти на рыночные отношения. Только они и помогут развязать этот гордиев узел.

Понятно, что такой путь не устраивает белорусского лидера. Во-первых, очень тяжело свыкнуться с мыслью, что от твоей страны требуют такую же плату, как, к примеру, с Украины, и отказываются продавать газ по внутренним российским ценам. Ведь Беларусь всегда претендовала и, что самое важное, имела особые отношения с Россией, что и позволяло ей иметь отличные дивиденды от такой дружбы. Во-вторых, Россия своими решениями подталкивает Беларусь к внедрению рыночных отношений в ее экономике. Белорусскому президенту это явно не нравится. Вот и теперь он с раздражением говорил о реформах в России, где, как выходит по его словам, весь газ отдали Миллеру, все электричество — Чубайсу и даже акционируют железные дороги.

Перед телевизионными камерами Александр Лукашенко говорит, что он не может отдать "Белтрансгаз" России, поскольку это общенациональное достояние белорусского народа. В искренность этого заявления мне лично не верится. Спросите сегодня любого так называемого простого человека: что он лично имеет от этого так называемого общенародного достояния? Абсолютно ничего. Ему сегодня абсолютно без разницы, кто владеет трубой, — "Белтрансгаз" или "Газпром". А вот для руководителя Беларуси это жизненно важно. Пока ведущее газовое предприятие, равно как и автомобильный, тракторный, телевизионный и прочие крупнейшие заводы будут "общенародным достоянием", именно Александр Лукашенко и будет оставаться реальным хозяином всех их и всей Беларуси. С переходом на рыночные каноны эти предприятия уйдут в самостоятельную жизнь, уйдут из-под тотального контроля. И президент Беларуси это прекрасно понимает. Но переход белорусской экономики на рыночные рельсы означает не только потерю распоряжаться большущими финансовыми потоками. Рыночная экономика объективно ведет к демократизации всей общественной жизни. Чем больше рынка, тем больше свободы: новых газет, новых партий, новых лидеров... Вот оно, наглядное слияние экономики и политики. Его-то как раз и опасается больше всего белорусский вождь.

Кстати, и финансы играют во всей этой истории далеко не последнюю роль.

Общеизвестно, что разница между ценой, по которой Беларусь покупает газ у России, и ценой, по которой она затем продает внутренним пользователям, достигает порядка 20 долларов на одной тысяче кубов. Куда идет разница? В доход бюджета не попадает. Эксперты заметили: строчка социальных расходов — намного меньше по сумме этой прибыли. Но куда-то же деньги уходят. Правительство, правда, заявляет, что они якобы перераспределяются внутри белорусской экономики. Даже если допустить, что это так, не ясно, почему такая важная операция осуществляется без контроля, если не публичного (у нас к этому не привыкли), то хотя бы парламентского.

Россия предложила Беларуси взять льготный кредит на погашение задолженности. Беларусь отказалась. Александр Лукашенко заявил: **"Ничего у них не берите. Они нищие".**

Но и здесь президент Беларуси, похоже, хитрит. Это ли подлинная причина? Срок возврата кредита попадает на 2006 год. А это время особое — год выборов нового президента Беларуси, и потому явно прослеживается желание не попасть в зависимость от Москвы. Ибо кому, как не Александру Лукашенко, лучше других знать о возможностях Кремля. Ведь это его российские покровители с совершенно определенными целями способствовали приходу его к власти в 1994 году и даже поддерживали неприкрытые амбиции на российский трон, отчетливо взыгравшие в середине 90-х годов. Они же всегда приходили на выручку в самые трудные моменты: достаточно вспомнить референдум 1996 когда, когда Александр Григорьевич "прихватил" к своему президентскому сроку еще два года...

Российский фактор, на мой взгляд, самый весомый на белорусском политическом поле. Любое движение в сторону Беларуси Владимира Путина вызовет у значительной части населения ответную реакцию. Но российский президент до сих пор молчит. И это, мне кажется, безумно нервирует его белорусского коллегу. Он просто не знает, что делать дальше...

А теперь возвращаюсь к началу своей статьи. События последних дней означают только одно — внутри России белорусский фактор потерял былую актуальность. На нем не только нового капитала не приобретешь, но даже старый растеряешь. В Минске в это както долго не верилось. И теперь, оказывается, зря.

РАКУРС

Усхопчик получил орден

Генерала, которого разыскивает литовская прокуратура, Лукашенко наградил орденом «За службу Родине» I степени.



Так ответит Владимир Усхопчик перед литовским народом или нет?

Как сообщает пресс-служба президента, высокую награду Усхопчик получил 23 февраля в присутствии высшего офицерского состава страны. *"Этой высокой награды Владимир Усхопчик удостоен за многолетнюю добросовестную службу в Вооруженных силах,* — сообщается далее в пресс-релизе, — *образцовое исполнение воинского долга и высокие личные показатели в служебной деятельности".* А.Лукашенко называет Усхопчика *"настоящим генералом, который предан белорусскому народу и своему воинскому долгу"*.

Наверное, будь на месте Усхопчика другой генерал-лейтенант белорусской армии, это сообщение осталось бы незамеченным. Ничего особенного, нормальное завершение военной карьеры. На прошлой неделе, как известно, Владимир Усхопчик подал рапорт об освобождении его от должности замминистра обороны. Рапорт был удовлетворен, и Усхопчик отправлен в распоряжение министра. Однако есть в биографии генерал-лейтенанта одно "но". С 2001 года Владимир Усхопчик находится в розыске. Его разыскивает прокуратура Литвы.

Об этом офицере "Народная воля" писала не единожды. В газете даже были опубликованы выдержки из постановления о розыске Усхопчика. Литовская сторона обвиняет его в попытке свержения законно избранной власти Литвы в 1990-1991 годах, в действиях, приведших к убийству мирных граждан во время трагических событий в Вильнюсе в январе 1991 года, когда отстаивать демократию на улицы города и к телецентру вышли тысячи литовцев.

Летом 1991 года Усхопчик переехал из Литвы в Беларусь. С 1992 года сотрудники прокуратуры Литвы регулярно требовали у белорусских властей выдачи Усхопчика. Но тогда беглый офицер не занимал высоких должностей, он жил в Бобруйске, командовал 5-м гвардейским корпусом. В 1994 году в отношении Усхопчика литовская прокуратура возбудила уголовное дело по нескольким статьям. Усхопчика обвинили в многочисленных преступлениях, объявили в розыск. Однако и после этого белорусское руководство не выдало Усхопчика литовским властям. Более того, в мае 2000 года Усхопчик был назначен на должность заместителя министра обороны Беларуси. 3 июля ему доверили принимать военный парад в белорусской столице. Год спустя, накануне дня освобождения Беларуси от фашистских захватчиков, послы стран Балтии официально заявили, что откажутся от участия в военном параде, если этим парадом будет командовать Владимир Усхопчик... И вот 2004 год. Усхопчик уходит в отставку и получает из рук белорусского правителя орден и слова похвалы: "...это настоящий генерал".

Как литовская сторона отреагировала на очередной, вызывающий шаг белорусских властей? В посольстве Литовской Республики дипломатично уклоняются от каких-либо комментариев. *"Это решение белорусской стороны, президента,* — говорит советник посольства **Марюс Януконис**. — *Мы не можем влиять на внутренние дела государства, на принятие каких-либо решений. В данном случае: наградить или ... Но позиция Литвы в отношении Усхопчика не изменилась: до сих пор он находится в розыске".*

Мария ЭЙСМОНТ.

ВІНШУЕМ!

Быць на зямлі чалавекам

У нашым горадзе і вобласці яго ведаюць многія. Старэйшы педагог Прынёмання, дацэнт Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Я.Купалы, ветэран Айчыннай вайны ***Мікола Аляксандравіч МЕЛЬНІКАЎ*** *такі чалавек, сустрэча з якім мала каго пакіне раўнадушным.*

У гэтыя дні сівагаловы "аксакал" прымае шмат віншаванняў: у яго — 80-гадовы юбілей.

Усё, што засталося за яго плячыма, што пройдзена, пражыта і перажыта, выпакутавана на нялёгкім пакручастым шляху, ён лічыць сваім набыткам і нічога не хоча забываць. А былі ягоныя дарогі, як амаль у кожнага, рознымі: радаснымі і змрочнымі, уздымнымі і трывожнымі, нават трагічнымі. Часам, можна сказаць, яго жыццё вісела на валаску.

...Яшчэ ў канцы 20-х гадоў сялянскую сям'ю Мельнікавых, што жыла на Магілёўшчыне, рэпрэсіравалі, а гаспадарку, зладжаную земляробскім мазалём і потам, разрабавалі. Тры гады малы Міколка разам з бацькамі правёў у спецлагеры на Валагодчыне, дзе такія ж, як ён, дзеці паміралі ў страшэнных муках у яго на вачах. Бацька рабіў два пабегі з таго пекла, маці — аж тры, за што і трапіла на будоўлю Беламорканала. А Міколку цудам удалося ўратавацца з лагера і пасля некалькіх гадоў беспрытульнага, галоднага бадзяння "на волі" яму, нарэшце, пашчасціла прыбіцца да свайго дзядзькі на Алтаі.

Здольны юнак перад самай вайной стаў студэнтам літфака Магілёўскага педінстытута. Але грымнуў трагічны 41-ы, і ўжо ў ліпені ён, як і іншыя, абараняў Магілёў. Потым быў у партызанскім атрадзе "Беларусь", дзе ён камандаваў аддзяленнем і рэдагаваў газету. Пра адну з неардынарных старонак тых суровых дзён, што ўразаюцца ў сэрца назаўжды, сам расказаў у "Народнай волі" ў пранікнёным нарысе "Санінструктара Ганну Супруненка — расстраляць!"



Затым — франтавыя дарогі ў радах Чырвонай арміі. Тут насамрэч адлік часу ішоў на імгненні, якія штодня, штохвіліны кулямі свісцелі ля скроні, але няўхільна набліжалі нашу Перамогу над ворагам. Ды пакуль настаў той доўгачаканы май 45-га, яшчэ трэба было ачысціць ад фашыстаў Беларусь, прайсці з баямі Польшчу, штурмаваць Кёнігсберг. Шмат распавядаў мне пра ўсё гэта ветэран, толькі ў тым аповедзе мала было радаснага: вайна — яна і ёсць вайна...

Ды і ў мірны час спакойнае жыццё — не для Мікалая Аляксандравіча. На Гродзеншчыне абаронцу Радзімы на ратным полі ведаюць і як нязломнага змагара на асветніцкім фронце за патрыятычнае выхаванне моладзі. Скончыць абарваную вайной вучобу яму давялося ўжо ў 1949-м. Аспірантура, праца ў вышэйшай школе... Амаль 45 гадоў аддаў выдатны педагог Гродзенскаму дзяржаўнаму універсітэту імя Янкі Купалы. У свой час узначальваў тут кафедру рускай і замежнай літаратуры, напісаў шэраг кніжак і артыкулаў па актуальных праблемах выкладання літаратуры. Але тут не абышлося без успрымання ў штыкі некаторых яго наватарскіх думак аб развіцці творчага патэнцыялу будучага настаўніка.

Асаблівае і, бадай, галоўнае поле дзейнасці няўрымслівага, творчага чалавека — навукова-асветніцкая, гісторыка-культурная, краяведчая праца ў *Гродзенскім грамадскім аб'яданні ветэранаў вайны, працы і Узброеных сіл,* якое ён узначальвае з першага дня яго заснавання, стварэнне маладзёжнага цэнтра культуры імя Кастуся Каліноўскага. Мікалай Аляксандравіч і яго паплечнікі светлым абавязкам лічаць адраджэнне, разам з маладымі, духоўных і культурных скарбаў продкаў, іх патрыятычных традыцый і высокай маральнасці чалавека, які ў любых варунках і выпрабаваннях застаецца чалавекам, жыве па сумленні. Варта пабываць хаця б у літаратурна-творчых гуртках некаторых школ, каб у гэтым пераканацца.

Пра таго, хто са шчырай улюбёнасцю і не па гадах маладой апантанасцю арганізоўвае ўсю гэтую высакародную працу хораша напісалі на апошняй старонцы свайго *дзённіка-альбома "Летапіс"* самі вучні, удзельнікі літаратурна-краязнаўчага клуба імя Максіма Багдановіча. Вось фрагменты гэтага запісу: "Два гады побач з цудоўным настаўнікам нам кажуць: у кожную працу трэба ўкладваць часцінку сваёй душы, каб твае намаганні зацікавілі і захапілі іншых. Мікалай Аляксандравіч абудзіў нашу любоў да роднага слова, дапамагае зрабіць крок да любай Бацькаўшчыны".

На сваім шляху даўжынёю ў 80 год ветэран вайны і працы дапамог і дапамагае знайсці годную дарогу ў жыцці многім і многім, каму перадае свой жыццёвы вопыт і духоўнае багацце. Таму і сам з гадамі не старэе, гэты нястомны руплівец на ніве беларушчыны. Яму да ўсяго справа, да ўсяго неабыякавыя адносіны. Мікалай Аляксандравіч актыўна выступаў у свой час у падтрымку Васіля Быкава, у абарону Ніла Гілевіча і Вольгі Іпатавай, а таксама Беларускага ліцэя ад тых, хто палівае брудам і нішчыць наш нацыянальны гонар. А цяпер руліцца аб увекавечанні памяці вялікага Быкава, які многа гадоў жыў і працаваў, пісаў творы ў нашым горадзе. І не шкадуе высілкаў дзеля беларускай школы Прынёманшчыны.

З удзячнасцю думаю пра гэтага незвычайнага рупліўца ў добрых справах дзеля Беларусі, для якога вышэй за ўсе найвысокія званні — быць на зямлі **ЧАЛАВЕКАМ!**

Аляксей ДЗЕМІДОВІЧ.

Ад рэдакцыі. *Калектыў і чытачы газеты "Народная воля" сардэчна віншуюць адданага сына Бацькаўшчыны — нашага сябра Мікалая Аляксандравіча Мельнікава з 80-гадовым юбілеем, зычаць яму добрага здароўя, доўгіх год жыцця і новых высакародных спраў.*

Сустрэнемся ў пятніцу

Шаноўныя сябры!

На жаль, 26 лютага "Народная воля" не выйдзе. Але Вы не хвалюйцеся: да канца года атрымаеце планавую колькасць нумароў.

Сустрэнемся праз дзень, 27 лютага.

Рэдакцыя газеты "Народная воля".

И В ШУТКУ, И ВСЕРЬЕЗ

Действительно, как наш народ обойдется без «Боинга» для президента?..

Уважаемая редакция!

На днях слушала выступление нашего дорогого президента о проблемах с газом из России.

Какой он молодец — сразу сообразил, на чем "мы" будем экономить, чтоб платить за газ по 50 долларов, — на ветеранах, на лекарствах, на чернобыльцах...

Немножко странно, что не на салютах, "Боинге" для президента, не на добавках к зарплатам чиновников, не на том, что будет заморожено строительство телевышки, новых ледовых дворцов...

Наверное, у меня неправильное понятие о том, что народу действительно необходимо? Действительно, как народ обойдется без "Боинга" для президента?

С уважением —

Г.Н.АНШУКОВА, пенсионерка.

ПУЛЬС

70 працэнтаў аўтобусаў — развалюхі

70 працэнтаў парка аўтобусаў і 47 працэнтаў тралейбусаў у Гомелі поўнасцю адпрацавалі свой тэрмін, а замена рухомага саставу ідзе вельмі нізкімі тэмпамі, паведаміў БелаПАН начальнік аддзела гарадской гаспадаркі Аляксандр Падольскі.

Паводле яго звестак, у 2003 годзе за кошт сродкаў транспартнага збору было набыта 8 тралейбусаў і 2 аўтобусы, і толькі 21 тралейбус і 6 аўтобусаў прайшлі капітальны рамонт. Усяго на сёння ў Гомелі працуе 177 тралейбусаў і 158 аўтобусаў. Вырашаць праблемы, якія паўстаюць перад імі, транспартнікі Гомеля маюць намер шляхам арганізацыі аднаўленчага рамонту рухомага саставу, вузлоў і агрэгатаў уласнымі сіламі, а сродкі транспартнага збору будуць накіраваны на абнаўленне парка.

Алена ПАСКАННАЯ.

Максім Мірны падняўся

Беларускі тэнісіст Максім Мірны падняўся са 101-га на 45-е месца ў чэмпіёнскай гонцы Асацыяцыі тэнісістаў-прафесіяналаў (гэты рэйтынг улічвае вынікі бягучага сезона). На рахунку спартсмена 26 ачкоў (было 4). Павышэнне рэйтынгу звязана з удзелам М.Мірнага на мінулым тыдні ў прэстыжным турніры ў Ратэрдаме, дзе ён дайшоў да паўфінала.

Уладзімір Ваўчкоў, наадварот, апусціўся са 118-га на 135-е месца (3 ачкі), бо з-за траўмы пакуль не ўдзельнічае ў спаборніцтвах. У чэмпіёнскай гонцы лідзіруе швейцарац Ражэ Федэрэр (212 ачкоў). На даволі высокіх пазіцыях прадстаўнікі Аргенціны, з якой беларусам у красавіку давядзецца згуляць чвэрцьфінальны матч Кубка Дэвіса. Давід Налбандзян займае 17-е месца (50 ачкоў), Гільерма Корыа — 23-е (39), Агусцін Калеры — 34-е (33).

У рэйтынгу тэнісістаў, якія выступаюць у парным разрадзе, М.Мірны па-ранейшаму займае трэцяе месца.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

Вясна на сяле пачнецца 10 красавіка

Прадпрыемствы па забеспячэнні нафтапрадуктамі дзяржаўнага канцэрна "Белнафтахім" паставяць сёлета сельскагаспадарчым арганізацыям для правядзення веснавых палявых работ 220 тысяч тон дызельнага паліва і 50 тысяч тон аўтамабільнага бензіну. Пра гэта БелаПАН паведаміў намеснік начальніка аддзела земляробства і раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Віктар Корнеў.

Паводле яго слоў, гэты аб'ём нафтапрадуктаў будзе рэалізоўвацца па льготных цэнах. Усяго на закупку гаруча-змазачных матэрыялаў Мінсельгасхарчу і аблвыканкамам неабходна выдзеліць 260,6 мільярда рублёў.

Масавая веснавая сяўба, паведаміў В.Корнеў, пачнецца 10 красавіка, завяршыць яе плануецца да 1 мая.

Вольга ЛАПІКАВА.

У мікрараёне Малінаўка спынілі транспарт. Часова

З 24 па 29 лютага поўнасцю закрыты для руху транспарту ўчастак вуліцы Рафіева, ад вуліцы Слабадской да вуліцы Ясеніна, у мінскім мікрараёне Малінаўка.

Як паведамілі БелаПАН ва ўпраўленні транспарту і сувязі Мінгарвыканкама, вуліца закрыта з-за рамонту цеплатрасы, што праводзіцца ў сувязі з будаўніцтвам паблізу ўчастка жылога дома.

На гэты час змяняецца схема руху пяці аўтобусных маршрутаў, якія зараз ідуць акружным шляхам. Паводле звестак упраўлення, маршруты №№ 12 і 23 следуюць па вуліцах Ясеніна і Рафіева ў прамым і зваротным кірунках з усімі прыпынкамі; маршруты №№ 75, 81, 104 і 583 — па вуліцах Слабадская, Громава, Ясеніна, Рафіева ў прамым і зваротным кірунках, не робячы прыпынкаў на аб'язным шляху.

Лавінія АРЭШКА.

У мінскіх кінатэатрах — скідкі

Сёлета цэны на білеты ў кінатэатры Мінска падзяліліся ў залежнасці ад кінасеансаў — у будні, выхадныя дні і вячэрні час (ён пачынаецца з 16-й гадзіны).

Як паведаміў БелаПАН генеральны дырэктар унітарнага прадпрыемства "Кінавідэапракат" Васіль Коктыш, цана на білеты вячэрніх сеансаў у выхадныя дні павялічана на 50 працэнтаў. "Калі ў будні дзень білет на сеанс у кінатэатр, аснашчаны сістэмай "Долбі", каштуе 2 тысячы рублёў, то ў вячэрні час і ў выхадны дзень — 3 тысячы", — сказаў ён.

Паводле слоў В.Коктыша, у "кінатэатрах вышэйшага разраду, не аснашчаных сістэмай "Долбі" (к/т "Партызан", "Салют"), білет на дзённы сеанс каштуе 1 тысячу рублёў, на вячэрні і ў выхадны дзень — 1,5 тысячы рублёў; у кінатэатрах 3-га разраду (к/т "Піянер", "Электрон", "Кіеў") адпаведна, 800 рублёў і 1,2 тысячы.

На білеты для дзяцей устаноўлена цана 800 рублёў (у залах, аснашчаных "Долбі") і 600 рублёў.

Для таго каб дыферэнцыяваць цэны на білеты і даць магчымасць розным катэгорыям насельніцтва паглядзець фільмы, распрацавана сістэма надбавак, скідак і льгот пры наведванні сталічных кінатэатраў, паведаміў В.Коктыш. Скідка да 50 працэнтаў прымяняецца да цэн на кінавідэабілеты, калі фільм дэманструецца ў Мінску больш чым месяц. Прадугледжана і сістэма льгот. Так, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны наведваюць усе сеансы бясплатна па прад'яўленні пасведчання, але пры наяўнасці свабодных месцаў у кіназале. Вайскоўцы, што бралі ўдзел у баявых дзеяннях і ваенных канфліктах на тэрыторыі іншых краін, інваліды ўсіх груп могуць наведваць усе кінасеансы па льготным (50 працэнтаў) кошце білета.

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

БОЛЬ

Ратаваліся дзеці ад холаду

Нехта з мудрацоў сказаў, што са смерцю чалавека гіне цэлы свет, бо ў гэты час наступае крах замыслаў, пачуццяў, надзей і планаў, а разам з нябожчыкам пазбаўляюцца жыцця і ягоныя магчымыя нашчадкі. Цяжка нават уявіць маштаб трагедыі, калі загінула малое дзіця, якое не паспела яшчэ спазнаць нават самых простых чалавечых радасцяў і здзяйсненняў...

Толькі па віне дарослых загінулі ў пакутах сярод белага дня трое малых дзяцей у вёсцы Смалоўка Гарадоцкага раёна Віцебшчыны. Маці гэтых дзяцей — двух, трох і чатырох гадоў — зранку накіравалася на працу, загадаўшы мужу прапаліць печку. Гаспадар хаты, вядомы ў вёсцы выпівоха, спаў пасля ўчарашняй выпіўкі. Ачомаўшыся ад ранішняга холаду, ён накінуў на ўваходныя дзверы завесу і хуценька пашыбаваў да брата — гнаць гарэлку.

Не вытрымаўшы марознага холаду, малыя спачатку паспрабавалі самі распаліць печку. А калі гэта не атрымалася, разлілі па падлозе вогнішча, ад якога неўзабаве занялася агнём уся хата.

Калі пачаўся сапраўдны пажар, дзеці спужаліся, выбеглі на веранду і сталі крычаць аб ратунку, але нікто з суседзяў іх не пачуў.

Такую жорсткасць немагчыма зразумець, нават ведаючы аб непавазе суседзяў да бацькоў няшчасных дзетак.

Выратавальнікаў выклікалі толькі праз 40 хвілін пасля пачатку пажару, ды і не жыхары Смалоўкі, а людзі з суседняй вёскі, дзе бачылі дым да неба.

У сям'і пагарэльцаў ёсць яшчэ адно дзіця, якому можна сказаць, пашанцавала: у момант пажару яно было ў бабулі. А дзецей выратаваць не ўдалося.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ДУША БОЛИТ...

Космонавты

«Надо посадить всех пенсионеров на космический корабль и отправить куда-нибудь подальше. Все равно мы никому не нужны — ни детям, ни государству».

Из разговора двух пожилых женщин на автобусной остановке.

Людмила ГРЯЗНОВА, председатель "Правозащитного альянса"

Недавно пришлось стать свидетельницей такого разговора двух пенсионерок, стоявших на автобусной остановке в ожидании транспорта. Фраза о космическом корабле потрясла. Как нелегко приходится сегодня пожилым людям, что они даже готовы отправится куда-нибудь подальше, только не быть обузой у детей и государства. Стало страшно от того, в каком мире мы живем. Вроде в стране нет военных действий и катастроф, не надо все отдавать для фронта и для победы, а столько народа, прежде всего пенсионеров, поставлены на грань выживания. Чтобы увидеть эту грань, заглянем в квартиры пожилых людей.

...*Зинаида Петровна* уже давно на пенсии, живет одна. Есть сын, который иногда приходит и приносит продукты. Сама ходить в магазин не может, плохо с ногами. Для нее рост коммунальных платежей означает невозможность купить лекарства. Врач приходит, выписывает рецепты, но денег на их покупку нет.

...*Валерий Иванович* после смерти жены остался один в двухкомнатной квартире. На пенсии уже десять лет. Пока была жива жена, справлялись с домашними проблемами. Но когда она ушла, все покатилось в пропасть. Однажды пришел сын в гости, повздорил с ним, и стало плохо Валерию Петровичу. Вызвали "скорую", та поставила диагноз "инсульт". После больницы вернулся домой, но левая рука осталась без движения, левая нога приволакивается. Кое-как научился себя обслуживать. Но к нему почти никто не ходит. Общается в основном с телевизором. Что будет завтра, не задумывается, только по-детски улыбается.

...*Мария Игнатьевна* бойкая старушка живет с дочерью и внучкой. Небольшая трехкомнатная квартира на троих. Но дочь недавно попала под сокращение, перевели в охрану, где платят копейки. Главный доход в семье — бабушкина пенсия. После вычетов за квартиру и телефон, остается семьдесят тысяч. Вот и попробуй проживи. Покупает молоко, хлеб, масло и кости. Правда, есть у Марии Игнатьевны маленький приработок. Каждый день ходит в сквер за бутылками, сдает и получает за месяц еще около пятидесяти тысяч. Но эти деньги никак не спасают семью от обнищания, позволяют лишь продержаться какое-то время от окончательного падения.

...*Лидия Семеновна*, пенсионерка, живет одна. В Минске у нее две дочери и две внучки. У дочерей не сложилась семейная жизнь, воспитывают детей сами. Лидия Семеновна старается облегчить жизнь дочерям и внучкам. Но последние месяцы ничего у нее не получается. Еле-еле сводит концы с концами. Квартплата съедает больше половины пенсии. Открыто возмущается таким положением, спрашивает, неужели сегодня война, из-за которой приходится так бедствовать. Во время войны уж так наголодались, съедали весь щавель, который рос по лугам, собирали желуди и мололи их, из картофельной кожуры и зелени пекли лепешки. И все это ели. За что сегодня приходится снова затягивать пояса? За что страдают ее дочери, которые не могут обеспечивать собственных детей? Одна внучка учится в техникуме, красивая девочка. Но она бабушке заявила, что замуж не выйдет. Нынешние ребята женятся на богатых, бедным предлагают только сожительство. Другая дочка издергалась из-за постоянных поборов в школе. Деньги требуют от родителей на ремонт, факультативны, и это без конца.

... *Семен Адамович*, пенсионер, ему уже под восемьдесят. Живет один, но с домашним хозяйством справляется. Когда-то был директором крупного предприятия. Приехал в Беларусь с Украины в числе "двадцатипятитысячников". Видел тяжелые времена, сталкивался с разными людьми. После войны у него на предприятии работали пленные немцы, венгры и румыны. Немцы были дисциплинированными и хорошими работниками. Не их вина, что Гитлер всех поставил под ружье. Венгры были злыми, а румыны — голодными. Последние ели все, что попадало под руку. Один румын даже умер, объевшись зерна. Порядок на предприятии был образцовый. Советскую власть уважает, даже вспомнил, как однажды встречался с Поляковым, первым секретарем Гомельского обкома, и тот по-человечески к нему отнесся. Осуждает сталинские методы, но считает, что такой несправедливости, как сегодня, еще никогда не было.

...*Елена,* молодая пенсионерка, живет с сестрой-инвалидом в двухкомнатной квартире. Инвалидность сестры не дает права на льготу по квартплате. Кроме них в квартире обитают еще две собаки, за которые они платят ЖЭСу отдельно. Без собак они своей жизни не представляют. Еще как-то выкручиваются, помогает подруга из Израиля, которая посылает то деньги, то посылки. Подруга, правда, советует откладывать по двадцать долларов с пенсии каждый месяц и никак не может представить себе, что ровно столько у Елены остается от пенсии после уплаты всех коммунальных услуг и телефона.

...*Римма Львовна,* энергичная пенсионерка, недавно похоронившая мужа. И она, и муж — бывшие детдомовцы, муж — ветеран трудового фронта. Но когда пришлось его хоронить, никто из местных властей не пришел на помощь. Более того, потребовали уплатить налог с двухсотдолларового перевода, который прислала племянница из Америки. Пределов ее возмущению не было границ. Благодаря своему упорству добилась отмены налога, но обида не проходит вот уже несколько месяцев.

